Статья 8. Постановления о применении амнистии, принятые органами дознания, предварительного следствия органами внутренних дел, начальниками исправительно-трудовых учреждений, спецкомендатур, командованием дисциплинарных батальонов, командирами воинских частей и начальниками военных учреждений, утверждаются прокурором.

Статья 9. Установить, что к военнослужащим, совершившим преступления, перечисленные в статье 1 настоящего закона, и не явившимся к месту службы, амнистия применяется в том случае, если они не позднее одного месяца после вступления в силу настоящего закона явятся для дальнейшего прохождения воинской службы в ближайшие органы военного управления (приемные Министерства обороны СССР и военных округов, флотов, военные комиссариаты, комендатуры), в Комитет при Президенте СССР по делам военнослужащих и членов их семей и аналогичные комитеты республик, в органы внутренних дел либо в воинские части, где они проходили действительную военную службу. Рекомендовать всесоюзному совету родителей военнослужащих оказывать содействие родителям и другим членам семей в явке военнослужащих для применения к ним настоящей амнистии и дальнейшего прохождения службы.

Настоящий закон не применяется к военнослужащим, уклонившимся от военной службы после вступления этого закона в силу.

В связи с тем, что значительное число уклонений от военной службы обусловлено неуставными отношениями по месту службы, министру обороны СССР, министру внутренних дел СССР, руководителям других ведомств, имеющих в своем составе воинские формирования, принять меры к распределению военнослужащих и военных строителей для продолжения службы в условиях, исключающих предпосылки последующих противоправных действий.

Время уклонения от военной службы может быть зачтено военнослужащим в срок действительной военной службы при условии их дальнейшей безупречной службы не менее шести месяцев в порядке, устанавливаемом соответственно министром обороны СССР, министром внутренних дел СССР, руководителями других ведомств, имеющих в своем составе воинские формирования.

Статья 10. Настоящий закон вступает в силу с момента его опубликования и подлежит исполнению в течение трех месяцев.

Президент Союза Советских Социалистических Республик
М. ГОРБАЧЕВ.

Москва, Кремль
1 ноября 1991 г.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь

РАЗДЗЕЛ. І. Агульныя палажэнні

Артыкул 1. Грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь — неад'емны атрыбут дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, які вызначае прыналежнасць асобы да дзяржавы, абумоўлівае сукупнасць яе правоў і абавязкаў і іх абарону з боку Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 2. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь

Грамадзянамі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца:

1) асобы, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на дзень уступлення ў сілу гэтага Закона;

2) асобы, якія набылі грамадзянства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтым Законам.

Артыкул 3. Роўнае грамадзянства

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь з'яўляецца роўным для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь незалежна ад падстаў яго набыцця.

Артыкул 4. Права на грамадзянства

Грамадзянін Рэспублікі Беларусь не можа быць пазбаўлены грамадзянства. Ніхто з грамадзян Рэспублікі Беларусь не можа быць адвольна пазбаўлены права змяніць грамадзянства.

Артыкул 5. Абарона дзяржавай правоў і законных інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь

Дзяржава абараняе правы і законныя інтарэсы грамадзян Рэспублікі Беларусь на сваёй тэрыторыі і за яе межамі.

У выпадку, калі ў краіне знаходжання грамадзян Рэспублікі Беларусь адсутнічаюць дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь, абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь можа ажыццяўляцца адпаведнымі органамі іншых дзяржаў.

Артыкул 6. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства

Замежнымі грамадзянамі ў Рэспубліцы Беларусь прызнаюцца асобы, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь і маюць доказы сваёй прыналежнасці да грамадзянства іншай дзяржавы.

Асобамі без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь прызнаюцца асобы, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, і не маюць доказаў сваёй прыналежнасці да грамадзянства іншай дзяржавы.

Прававое становішча замежных грамадзян і асоб без грамадзянства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рэгулюецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 7. Дакумент, які сведчыць аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь

Дакументам, які сведчыць аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Узор пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, парадак і ўмовы яго выдачы вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

РАЗДЗЕЛ II. Набыццё і захаванне грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Артыкул 8. Падставы набыцця грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь набываецца:

1) па нараджэнню;

2) у выніку прыёму ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

3) на іншых падставах, якія прадугледжаны міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь або гэтым Законам.

Артыкул 9. Грамадзянства дзіцяці, бацькі якога з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь

Дзіця, бацькі якога на момант яго нараджэння — грамадзяне Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь незалежна ад месца свайго нараджэння.

Артыкул 10. Грамадзянства дзіцяці, адзін з бацькоў якога з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь

У выпадку, калі на момант нараджэння дзіцяці адзін з яго бацькоў быў грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, дзіця з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, калі:

1) яно нарадзілася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

2) яно нарадзілася за межамі Рэспублікі Беларусь, але яго бацькі або адзін з іх у гэты час пастаянна пражывалі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Калі на момант нараджэння дзіцяці яго бацькі, адзін з якіх з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, пастаянна пражывалі за межамі Рэспублікі Беларусь, грамадзянства дзіцяці, што нарадзілася за межамі Рэспублікі Беларусь, вызначаецца па рашэнню бацькоў, выказанаму ў пісьмовай форме.

Калі на момант нараджэння дзіцяці адзін з бацькоў быў невядомы або не меў ніякага грамадзянства, а другі быў грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, дзіця з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь незалежна ад месца нараджэння.

Артыкул 11. Набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь дзіцем, бацькі якога з'яўляюцца асобамі без грамадзянства

Дзіця, бацькі якога з'яўляюцца асобамі без грамадзянства і якое нарадзілася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, лічыцца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 12. Грамадзянства дзіцяці, бацькі якога невядомы

Дзіця, якое знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, бацькі якога невядомы, з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 13. Умовы прыёму ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь

У грамадзянства Рэспублікі Беларусь можа быць прынята асоба ў адпаведнасці з яе хадайніцтвам, калі яна:

1) бярэ на сябе абавязацельства выконваць і паважаць Канстытуцыю і законы Рэспублікі Беларусь;

2) ведае дзяржаўную мову Рэспублікі Беларусь у межах, неабходных для зносін;

3) пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на працягу апошніх 7 гадоў;

4) мае законную на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь крыніцу існавання.

Артыкул 14. Набыццё і захаванне грамадзянства Рэспублікі Беларусь пры заключэнні і скасаванні шлюбу

Заключэнне або скасаванне шлюбу грамадзянінам Рэспублікі Беларусь з грамадзянінам іншай дзяржавы або асобай без грамадзянства не мяняе грамадзянства мужа і жонкі.

Асоба, якая заключыла шлюб з грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, прымаецца ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці яе жадання і выканання ўмоў, прадугледжаных артыкулам 13 гэтага Закона.

Артыкул 15. Захаванне грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Пражыванне грамадзяніна Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі іншай дзяржавы само па сабе не вядзе да страты грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 16. Недапушчальнасць выдачы грамадзяніна Рэспублікі Беларусь іншай дзяржаве

Грамадзянін Рэспублікі Беларусь не можа быць выдадзены іншай дзяржаве, калі гэта не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 17. Захаванне права на набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Права на набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь захоўваецца за асобамі, якія пастаянна пражывалі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, але былі прымусова выселены з яе тэрыторыі або выехалі за яе межы да ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона, а таксама за іх нашчадкамі.

Такое ж права на набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь маюць беларусы, а таксама асобы, якія ідэнтыфікуюць сябе як беларусы і іх дзеці, што нарадзіліся за межамі сучаснай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Грамадзянства такім асобам прадастаўляецца пры наяўнасці іх жадання і ўмоў, прадугледжаных артыкулам 13 гэтага Закона, за выключэннем тэрміну пражывання.

РАЗДЗЕЛ III. Спыненне грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Аднаўленне ў грамадзянстве Рэспублікі Беларусь

Артыкул 18. Падставы спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь спыняецца:

1) з прычыны выхаду з грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

2) з прычыны страты грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

3) на іншых падставах, прадугледжаных гэтым Законам.

Артыкул 19. Выхад з грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Выхад з грамадзянства Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца па хадайніцтву асобы ў парадку, устаноўленым гэтым Законам.

Выхад з грамадзянства Рэспублікі Беларусь не дапускаецца, калі асоба, якая хадайнічае аб выхадзе, прыцягнута да крымінальнай адказнасці ў якасці абвінавачваемай або ў адносінах да яе ёсць прыгавор суда, які ўступіў у законную сілу і падлягае выкананню, або мае запазычанасць па падатках, або іншыя непагашаныя даўгі і абавязацельствы перад Рэспублікай Беларусь.

Артыкул 20. Страта грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь страчваецца:

1) з прычыны набыцця асобай грамадзянства іншай дзяржавы, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь;

2) з прычыны паступлення асобы на ваенную службу, службу бяспекі, у паліцыю, органы юстыцыі і іншыя органы дзяржаўнай улады і кіравання ў замежнай дзяржаве;

3) калі грамадзянства Рэспублікі Беларусь набыта ў выніку прадстаўлення заведама лжывых звестак або надложных дакументаў.

Страта грамадзянства Рэспублікі Беларусь настае з моманту рэгістрацыі дадзенага факта паўнамоцнымі дзяржаўнымі органамі, указанымі ў артыкулах 31 і 32 гэтага Закона.

Артыкул 21. Аднаўленне ў грамадзянстве Рэспублікі Беларусь

Асоба, якая пазбаўлена грамадзянства Рэспублікі Беларусь да ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона, можа быць па яе хадайніцтву або з яе згоды адноўлена ў грамадзянстве Рэспублікі Беларусь.

РАЗДЗЕЛ IV. Асобыя выпадкі змянення, захавання або страты грамадзянства

Артыкул 22. Змяненне грамадзянства дзіцяці ў выпадку змянення грамадзянства бацькамі

У выпадку змянення грамадзянства бацькамі або адным з іх, калі другі невядомы, адпаведным чынам мяняецца грамадзянства дзіцяці, калі яно не дасягнула ўзросту 16 гадоў.

Па жаданню бацькоў або аднаго з іх, калі другі невядомы, у выпадку змянення імі грамадзянства Рэспублікі Беларусь за дзіцем ва ўзросце да 16 гадоў можа захоўвацца грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 23. Захаванне грамадзянства Рэспублікі Беларусь дзіцем ва ўзросце да 16 гадоў, над якім устаноўлена апека або папячыцельства

Калі бацькі або адзін з бацькоў дзіцяці, якое пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, выходзяць з грамадзянства Рэспублікі Беларусь або страчваюць яго і пры гэтым не ўдзельнічаюць у выхаванні дзіцяці, над якім устаноўлена апека або папячыцельства грамадзян Рэспублікі Беларусь, дзіця па хадайніцтву апекуна або папячыцеля захоўвае грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 24. Набыццё дзіцем ва ўзросце да 16 гадоў грамадзянства Рэспублікі Беларусь у выпадку набыцця грамадзянства Рэспублікі Беларусь адным з бацькоў

Калі грамадзянства Рэспублікі Беларусь набывае адзін з бацькоў, а другі застаецца грамадзянінам іншай дзяржавы, дзіця можа набыць грамадзянства Рэспублікі Беларусь па сумеснаму хадайніцтву бацькоў.

Калі грамадзянства Рэспублікі Беларусь набывае адзін з бацькоў, а другі застаецца асобай без грамадзянства, дзіця, якое пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, становіцца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 25. Захаванне дзіцем ва ўзросце да 16 гадоў грамадзянства Рэспублікі Беларусь у выпадку выхаду аднаго з бацькоў з грамадзянства Рэспублікі Беларусь або яго страты

Калі адзін з бацькоў выходзіць з грамадзянства Рэспублікі Беларусь або страчвае яго, а другі застаецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, дзіця захоўвае грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Па хадайніцтву бацькоў такому дзіцяці можа быць дазволены выхад з грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 26. Набыццё дзіцем ва ўзросце да 16 гадоў грамадзянства Рэспублікі Беларусь у выпадку ўсынаўлення

Дзіця, якое з'яўляецца грамадзянінам іншай дзяржавы або асобай без грамадзянства, пры ўсынаўленні грамадзянамі Рэспублікі Беларусь становіцца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Дзіця, якое з'яўляецца грамадзянінам іншай дзяржавы, пры ўсынаўленні мужам і жонкай, адзін з якіх з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а другі — асобай без грамадзянства, становіцца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Дзіця, якое з'яўляецца асобай без грамадзянства, пры ўсынаўленні мужам і жонкай, адзін з якіх з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, становіцца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Дзіця, якое з'яўляецца грамадзянінам іншай дзяржавы, пры ўсынаўленні мужам і жонкай, адзін з якіх з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а другі — грамадзянінам іншай дзяржавы, становіцца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь па згодзе ўсынавіцеляў.

Артыкул 27. Захаванне дзіцем ва ўзросце да 16 гадоў грамадзянства Рэспублікі Беларусь у выпадку ўсынаўлення

Дзіця, якое з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, усыноўленае грамадзянамі іншай дзяржавы або ўсыноўленае мужам і жонкай, адзін з якіх з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а другі— грамадзянінам іншай дзяржавы, захоўвае грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Па хадайніцтву ўсынавіцеляў такому дзіцяці можа быць дазволены выхад з грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Дзіця, якое з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, усыноўленае асобамі без грамадзянства або ўсыноўленае мужам і жонкай, адзін з якіх з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а другі — асобай без грамадзянства, захоўвае грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 28. Змяненне грамадзянства дзяцей ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў.

Змяненне грамадзянства дзяцей ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў у выпадку змянення грамадзянства іх бацькоў, а таксама пры ўсынаўленні дапускаецца толькі са згоды дзяцей.

РАЗДЗЕЛ V. Органы, якія прымаюць рашэнні і афармляюць дакументы па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Артыкул 29. Орган, які прымае рашэнні па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь

У Рэспубліцы Беларусь органам, які прымае рашэнні па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Для папярэдняга разгляду пытанняў грамадзянства Рэспублікі Беларусь Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь утварае Камісію па пытаннях грамадзянства.

Артыкул 30. Органы, якія рыхтуюць і афармляюць дакументы аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь

Падрыхтоўку і афармленне дакументаў аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюць: на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь — Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь; за мяжой — Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 31. Паўнамоцтвы органаў унутраных спраў

Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, упраўленні, аддзелы ўнутраных спраў:

прымаюць ад асоб, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, заявы па пытаннях грамадзянства і разам з неабходнымі дакументамі накіроўваюць на разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь;

вызначаюць прыналежнасць асоб, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, да грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

рэгіструюць страту грамадзянства Рэспублікі Беларусь асобамі, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 32. Паўнамоцтвы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь

Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь:

прымаюць ад асоб, якія пастаянна пражываюць за мяжой, заявы па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь і разам з неабходнымі дакументамі накіроўваюць на разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь;

вызначаюць прыналежнасць асоб, якія пражываюць за мяжой, да грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

рэгіструюць страту грамадзянства Рэспублікі Беларусь асобамі, якія пастаянна пражываюць за мяжой;

вядуць улік грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за мяжой.

РАЗДЗЕЛ VI. Парадак падачы і разгляду дакументаў па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Артыкул 33. Падача дакументаў па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Пытанні прыёму, выхаду або аднаўлення ў грамадзянстве Рэспублікі Беларусь разглядаюцца пры наяўнасці пісьмовай заявы зацікаўленай асобы.

Да заявы аб прыёме ў грамадзянства прыкладаюцца наступныя дакументы: копія пасведчання аб нараджэнні, дакумент аб тэрміне пражывання ў Рэспубліцы Беларусь, дакумент аб крыніцы існавання.

У выпадках, прадугледжаных у раздзеле IV гэтага Закона, заявы па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь падаюцца бацькамі або іншымі законнымі прадстаўнікамі.

Артыкул 34. Парадак падачы дакументаў па пытаннях грамадзянства

Дакументы па пытаннях грамадзянства падаюцца на разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь праз органы ўнутраных спраў па месцы пастаяннага жыхарства заяўніка, а асобамі, якія пастаянна пражываюць за мяжой, — праз Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, або дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь.

Асоба, якая з'яўляецца грамадзянінам іншай дзяржавы, з якой Рэспублікай Беларусь заключаны дагавор аб прадухіленні двайнога грамадзянства, абавязана прадставіць дакумент, які сведчыць аб адносінах гэтай дзяржавы да намеру грамадзяніна змяніць грамадзянства.

Артыкул 35. Парадак разгляду дакументаў па пытаннях грамадзянства

Дакументы, якія паступілі ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з дзяржаўных органаў, указаных у артыкуле 30 гэтага Закона, разглядаюцца Камісіяй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях грамадзянства.

Камісія мае права запатрабаваць па справе, што знаходзіцца ў яе вядзенні, матэрыялы і дакументы ў адпаведных дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў, якія прадстаўляюць неабходную інфармацыю ва ўстаноўлены камісіяй тэрмін.

Камісія ўносіць на разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прапановы па кожнай заяве або прадстаўленню.

Рашэнне Камісіі афармляецца пратаколам, які падпісваецца ўсімі членамі Камісіі, што ўдзельнічалі ў пасяджэнні.

Артыкул 36. Вырашэнне пытанняў грамадзянства Рэспублікі Беларусь у Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і інфармаванне аб яго выніках

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь, аднаўленні ў грамадзянстве Рэспублікі Беларусь і аб выхадзе з грамадзянства Рэспублікі Беларусь выдае ўказы.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у выпадках адхілення хадайніцтваў аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь і страты грамадзянства Рэспублікі Беларусь на падставе пункта 3 артыкула 20 гэтага Закона прымае пастановы.

Гэтыя ўказы і пастановы друкуюцца ў «Ведамасцях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь».

Змяненні ў грамадзянстве пачынаюць дзейнічаць з дня прыняцця Указа або Пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, калі імі не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 37. Тэрмін разгляду заявы па пытаннях грамадзянства

Тэрмін разгляду заяў па пытаннях грамадзянства не павінен перавышаць аднаго года.

Артыкул 38. Паўторны разгляд хадайніцтваў па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Паўторныя хадайніцтвы асобы аб прыёме ў грамадзянства, аднаўленні ў грамадзянстве Рэспублікі Беларусь або выхадзе з грамадзянства Рэспублікі Беларусь прымаюцца не раней чым праз год пасля прыняцця папярэдняга рашэння. У выпадку ўзнікнення істотных для справы абставін, якія не былі і не маглі быць вядомы заяўніку, паўторная заява можа быць разгледжана і раней.

РАЗДЗЕЛ VII. Выкананне рашэнняў па пытаннях грамадзянства

Артыкул 39. Органы, якія выконваюць рашэнні па пытаннях грамадзянства

Рашэнні па пытаннях грамадзянства ў адносінах да асоб, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, выконваюцца Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, упраўленнямі, аддзеламі ўнутраных спраў, а ў адносінах да асоб, якія пражываюць за мяжой, — Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 40. Кантроль за выкананнем рашэнняў па пытаннях грамадзянства

Кантроль за выкананнем рашэнняў па пытаннях грамадзянства ажыццяўляецца Камісіяй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях грамадзянства.

Артыкул 41. Парадак разгляду хадайніцтваў па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Парадак разгляду хадайніцтваў па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь і выканання прынятых рашэнняў вызначаецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

РАЗДЗЕЛ VIII. Абскарджанне рашэнняў па пытаннях грамадзянства

Артыкул 42. Абскарджанне рашэнняў па пытаннях грамадзянства

Рашэнні па пытаннях грамадзянства, прынятыя Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, могуць быць абскарджаны ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, які разглядае такія справы ў якасці суда першай інстанцыі.

Артыкул 43. Абскарджанне неправамерных дзеянняў службовых асоб па пытаннях грамадзянства

Неабгрунтаваная адмова ў прыёме заяў па пытаннях грамадзянства, парушэнне тэрмінаў разгляду заяў, а таксама іншыя неправамерныя дзеянні службовых асоб, якія парушаюць парадак разгляду спраў аб грамадзянстве і парадак выканання рашэнняў па пытаннях грамадзянства, могуць быць абскарджаны ў суд.

РАЗДЗЕЛ IX. Міжнародныя дагаворы

Артыкул 44. Прымяненне міжнародных дагавораў

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, што змяшчаюцца ў гэтым Законе, прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

18 кастрычніка 1991 г.
гор. Мінск.

ПАСТАНОВА

Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

АБ УВЯДЗЕННІ Ў ДЗЕЯННЕ ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ГРАМАДЗЯНСТВЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Устанавіць, што на перыяд да атрымання грамадзянамі Рэспублікі Беларусь пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь яны карыстаюцца пашпартам грамадзяніна СССР.

2. Палажэнне артыкула 17 Закона распаўсюджваецца таксама на грамадзян, якія асуджаны судамі Рэспублікі Беларусь і адбываюць пакаранне за яе межамі.

3. Устанавіць, што асобы, якія часова выехалі за межы Рэспублікі Беларусь у сувязі з:

прызывам на абавязковую тэрміновую ваенную службу;

прызывам афіцэраў з запасу на абавязковую ваенную службу на тэрмін да 3 гадоў;

працоўнымі, службовымі адносінамі (экіпажы суднаў, работнікі геалагічных, вышукальных партый, экспедыцый, прапаршчыкі, мічманы, ваеннаслужачыя звыштэрміновай службы і да т. п.) або навучаннем, лячэннем, накіраваннем на работу за мяжу;

аддачай на выхаванне ў дзяржаўныя дзіцячыя ўстановы, да сваякоў, апекуну ці папячыцелю або выкананнем абавязкаў апекуна ці папячыцеля,

прызнаюцца пастаянна пражываючымі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь вырашэнне пытанняў, звязаных з вызначэннем іншых катэгорый асоб, якія могуць быць прызнаны пастаянна пражываючымі або пражываўшымі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

4. Прызнаць страціўшымі сілу:

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 27 жніўня 1981 года «Аб парадку прыёму ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1981 г., № 27, арт. 552);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 лістапада 1981 года «Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якія ўносяць некаторыя змяненні і дапаўненні ў дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь» у частцы зацвярджэння Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 27 жніўня 1981 года «Аб парадку прыёму ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1981 г., № 33, арт. 676);

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 27 жніўня 1981 года «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку разгляду ў Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пытанняў, звязаных з прыёмам у грамадзянства Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., дадатак да № 6(8);

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 1987 года «Аб унясенні дапаўнення ў артыкул 11 Палажэння аб парадку разгляду ў Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пытанняў, звязаных з прыёмам у грамадзянства Рэспублікі Беларусь».

5. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць правядзенне неабходных мерапрыемстваў па выкананню Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь» і ўнесці адпаведныя прапановы на разгляд Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у тэрмін да 1 снежня 1991 года.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

18 кастрычніка 1991 г.
гор. Мінск.

Народная газета

Закон Рэспублікі Беларусь

«Аб парадку заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь»

Рэспубліка Беларусь заключае і выконвае міжнародныя дагаворы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права.

Выходзячы з прынцыпу абавязковасці кожнага дзеючага дагавора для яго ўдзельнікаў, Рэспубліка Беларусь, з'яўляючыся ўдзельнікам Венскай канвенцыі аб праве міжнародных дагавораў 1969 года, добрасумленна выконвае свае міжнародныя абавязацельствы.

I. Агульныя палажэнні

Артыкул 1. Задачы Закона

Гэты Закон устанаўлівае парадак заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных (міждзяржаўных, міжурадавых) дагавораў Рэспублікі Беларусь, які прымяняецца ў адносінах да ўсіх міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь незалежна ад іх формы і назвы (дагавор, пагадненне, канвенцыя, пакт, пратакол, абмен пісьмамі або нотамі, іншыя формы і назвы міжнародных дагавораў).

Парадак заключэння міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь міжпарламенцкага характару вызначаецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Парадак падпісання, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь міжведамаснага характару вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 2. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь

Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь заключаюцца з замежнымі дзяржавамі, іх адпаведнымі органамі, а таксама з міжнароднымі арганізацыямі ад імя:

Рэспублікі Беларусь;

урада Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 3. Спосабы выказвання згоды Рэспублікі Беларусь на абавязковасць міжнародных дагавораў

Згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе міжнароднага дагавора можа быць выказана падпісаннем дагавора, абменам дакументамі, якія ствараюць дагавор, ратыфікацыяй дагавора, яго прыняццем, зацвярджэннем, далучэннем да яго або любым іншым спосабам, аб якім умовіліся дагаворныя бакі.

II. Заключэнне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Артыкул 4. Прапановы аб заключэнні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Права на ўнясенне прапаноў аб заключэнні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь маюць суб'екты, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы ў Вярхоўным Савеце рэспублікі.

Прапановы аб заключэнні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь уносяцца ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Іншыя міністэрствы, дзяржаўныя камітэты і ведамствы Рэспублікі Беларусь падаюць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб заключэнні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь або па ўзгадненню з ім.

Артыкул 5. Прапановы аб заключэнні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія падлягаюць узгадненню з Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Прапановы аб заключэнні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія ўстанаўліваюць іншыя правілы, чым тыя, што змешчаны ў рэспубліканскім заканадаўстве, уносяцца ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Рашэнні аб правядзенні перагавораў і аб падпісанні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Рашэнні аб правядзенні перагавораў і аб падпісанні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь прымаюцца:

1) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь, — Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь;

2) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь па пытаннях, што адносяцца да ведання ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

3) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 7. Паўнамоцтвы на вядзенне перагавораў і на падпісанне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы на вядзенне перагавораў і на падпісанне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь выдаюцца:

1) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь, — Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь;

2) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь па пытаннях, што адносяцца да ведання ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

3) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Паўнамоцтвы на вядзенне перагавораў і на падпісанне ўказаных дагавораў могуць быць таксама выдадзены ад імя Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь або ўрада Рэспублікі Беларусь па іх даручэнню Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 8. Вядзенне перагавораў і падпісанне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь без спецыяльных паўнамоцтваў

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь маюць права весці перагаворы і падпісваць міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь без спецыяльных паўнамоцтваў.

Кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь у замежнай дзяржаве, кіраўнік прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь пры міжнароднай арганізацыі маюць права весці без спецыяльных паўнамоцтваў перагаворы аб заключэнні міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь адпаведна з дзяржавай знаходжання або ў рамках дадзенай міжнароднай арганізацыі.

Артыкул 9. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, якія падлягаюць ратыфікацыі

Ратыфікацыі падлягаюць міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь аб тэрытарыяльным размежаванні Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі, дагаворы, якія ўстанаўліваюць іншыя правілы, чым тыя, што змяшчаюцца ў заканадаўчых актах Рэспублікі Беларусь, а таксама дагаворы, пры заключэнні якіх бакі ўмовіліся аб наступнай ратыфікацыі.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь можа разглядаць пытанне аб ратыфікацыі іншых міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 10. Прапановы аб адабрэнні і ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Прапановы аб адабрэнні Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь і аб іх ратыфікацыі падаюцца ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь самастойна або сумесна ці па ўзгадненню з іншымі міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь разглядае такія прапановы і падае дагаворы на ратыфікацыю ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 11. Папярэдні разгляд прапаноў аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Папярэдні разгляд прапаноў аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, пададзеных на ратыфікацыю, праводзіцца адпаведнымі камісіямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якія даюць па іх заключэнні.

Артыкул 12. Прыняцце рашэнняў аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь ратыфікацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь праводзіцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь разглядае пададзеныя на ратыфікацыю міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь і выносіць адпаведныя рашэнні. Рашэнне Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб ратыфікацыі міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь прымаецца ў форме пастановы. На падставе пастановы аб ратыфікацыі Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь падпісваецца ратыфікацыйная грамата.

Артыкул 13. Абмен ратыфікацыйнымі граматамі і здача іх на захаванне

Абмен ратыфікацыйнымі граматамі і здача грамат аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь на захаванне дэпазітарыям праводзіцца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 14. Прыняцце або зацвярджэнне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія не падлягаюць ратыфікацыі

Прыняцце або зацвярджэнне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія не падлягаюць ратыфікацыі, але прадугледжваюць іх прыняцце або зацвярджэнне, праводзіцца:

1) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь, — Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь;

2) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя Рэспублікі Беларусь, па пытаннях, што адносяцца да ведання ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

3) у адносінах да дагавораў, якія заключаюцца ад імя ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 15. Далучэнне да міжнародных дагавораў

Рашэнні аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да міжнародных дагавораў прымаюцца:

1) у адносінах да дагавораў, якія падлягаюць ратыфікацыі, — Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь;

2) у адносінах да дагавораў, якія не падлягаюць ратыфікацыі, далучэнне да якіх праводзіцца ад імя Рэспублікі Беларусь, — Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь;

3) у адносінах да дагавораў, якія не падлягаюць ратыфікацыі, далучэнне ад якіх праводзіцца ад імя Рэспублікі Беларусь па пытаннях, што адносяцца да ведання ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

4) у адносінах да дагавораў, якія не падлягаюць ратыфікацыі, далучэнне да якіх праводзіцца ад імя ўрада Рэспублікі Беларусь, — Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

III. Выкананне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Артыкул 16. Захоўванне міжнародных дагавораў Рэспублікай Беларусь

Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь падлягаюць няўхільнаму захоўванню Рэспублікай Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права.

Артыкул 17. Забеспячэнне выканання міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прымае меры да забеспячэння выканання міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 18. Выкананне абавязацельстваў па міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь

Міністэрствы, дзяржаўныя камітэты, ведамствы Рэспублікі Беларусь і іншыя дзяржаўныя органы, у кампетэнцыю якіх уваходзяць пытанні, што рэгулююцца міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, забяспечваюць выкананне абавязацельстваў, прынятых па гэтых дагаворах Рэспублікай Беларусь, наглядаюць за ажыццяўленнем прыналежных Рэспубліцы Беларусь правоў, якія вынікаюць з дагавораў, і за выкананнем іншымі ўдзельнікамі дагавораў іх абавязацельстваў.

Артыкул 19. Агульнае нагляданне за выкананнем міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Агульнае нагляданне за выкананнем міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь забяспечвае ўлік і захаванне арыгіналаў або аўтэнтычных тэкстаў міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 20. Меры, якія прымаюцца ў выпадку парушэння міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь іншымі яго ўдзельнікамі.

У выпадку парушэння абавязацельстваў па міжнароднаму дагавору Рэспублікі Беларусь іншымі яго ўдзельнікамі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, іншыя міністэрствы, дзяржаўныя камітэты і ведамствы Рэспублікі Беларусь, сумесна або па ўзгадненню з Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, накіроўваюць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб прыняцці неабходных мер у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права.

У выпадку істотнага парушэння міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь іншымі яго ўдзельнікамі, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных нормамі міжнароднага права, такі дагавор можа быць спынены ў парадку, устаноўленым артыкуламі 24—27 гэтага Закона.

Артыкул 21. Прапановы аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у рэспубліканскае заканадаўства ў сувязі з заключэннем міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь

У выпадках, калі ў мэтах выканання міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь неабходна выданне закона Рэспублікі Беларусь або пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ці прыняцце пастановы або распараджэння Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, зацікаўленыя міністэрствы, дзяржаўныя камітэты і ведамствы Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку ўносяць прапановы аб прыняцці належнага акта.

IV. Апублікаванне і рэгістрацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Артыкул 22. Апублікаванне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Уступіўшыя ў сілу для Рэспублікі Беларусь міжнародныя дагаворы, дапаўненні, папраўкі, пратаколы і дадаткі да іх, заключаныя ад імя ўрада Рэспублікі Беларусь і ратыфікаваныя Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, публікуюцца ў «Ведамасцях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь».

Уступіўшыя ў сілу для Рэспублікі Беларусь міжнародныя дагаворы, дапаўненні, папраўкі, пратаколы і дадаткі да іх, заключаныя ад імя Рэспублікі Беларусь, рашэнні аб падпісанні якіх прыняты Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, дагаворы, дапаўненні, папраўкі, пратаколы і дадаткі да іх, якія заключаны ад імя Урада Рэспублікі Беларусь і не падлягаюць ратыфікацыі, дагаворы, дапаўненні, папраўкі, пратаколы і дадаткі да іх, далучэнне да якіх ці прыняцце якіх было ажыццёўлена на падставе рашэнняў урада Рэспублікі Беларусь, публікуюцца пасля ўнясення Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь у «Зборы пастаноў урада Рэспублікі Беларусь».

Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, дапаўненні, папраўкі, пратаколы і дадаткі да іх, аўтэнтычныя тэксты якіх складзены на замежных мовах, публікуюцца на адной з гэтых моў, на беларускай і рускай мовах.

Артыкул 23. Рэгістрацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Рэгістрацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь у Сакратарыяце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый або ў адпаведных органах іншых міжнародных арганізацый ажыццяўляецца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

V. Дэнансацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Артыкул 24. Прапановы аб дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Прапановы аб дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь уносяцца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь самастойна або сумесна ці па ўзгадненню з іншымі міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, які пры неабходнасці выносіць іх на разгляд Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 25. Папярэдні разгляд прапаноў аб дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь

Папярэдні разгляд прапаноў аб дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь праводзіцца адпаведнымі камісіямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якія даюць па ім заключэнні.

Артыкул 26. Дэнансацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь

Дэнансацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, заключаных ад імя Рэспублікі Беларусь, па прапанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь праводзіцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 27. Дэнансацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь

Дэнансацыя міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, заключаны ад імя ўрада Рэспублікі Беларусь, праводзіцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 кастрычніка 1991 г. гор. Мінск

ПАСТАНОВА
Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб парадку заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб парадку заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь» з дня яго прыняцця.

2. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 сакавіка 1992 года ўнесці ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні дзеючых заканадаўчых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам.

3. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 студзеня 1992 года распрацаваць парадак заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў міжведамаснага характару.

4. Даручыць Міністэрству замежных спраў Рэспублікі Беларусь унесці да 1 студзеня 1992 года ў адпаведным парадку прапановы па афармленню і выдачы паўнамоцтваў на вядзенне перагавораў і падпісанне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 кастрычніка 1991 г. гор. Мінск.

Закон Рэспублікі Беларусь

«Аб змяненні ў сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь»

У адпаведнасці з Дэкларацыяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Падпарадкаваць Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь.

2. Выбранне старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь праводзіцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь тэрмінам на 5 гадоў. Старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь складае свае паўнамоцтвы перад нававыбраным Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Кандыдатуру для выбрання на пасаду старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь прадстаўляе Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Намеснікі старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і члены калегіі Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь зацвярджаюцца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

3. У сувязі з прадугледжаным гэтым Законам змяненнем у сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 1979 года «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1979 г., № 18, арт. 296; 1990 г., № 21, арт. 370; Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 10 (12), арт. 117; № 27, арт. 424) наступныя змяненні:

з артыкула 14 выключыць пункт 1;

з артыкула 27 выключыць словы «Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 кастрычніка 1991 г. гор. Мінск

ВИДИТ ОКО

Плавучий миллион

Теплоход «Полесье», который гомельчане каждое лето созерцают на водной глади «Сожа», стал самым дорогим предметом на открытой в областном центре товарно-сырьевой бирже. Он оценен в один миллион рублей. Это обстоятельство вдохновило создателей «Полесья», — коллектив судостроительного-судоремонтного завода. В будущем году он собирается заработать таким образом еще несколько миллионов.

«Вика» на броне

Площадь Восстания в Гомеле с постаментом и танком на нем стала местом объяснения в самых сокровенных чувствах. После очередной ночи прохожие прочитали на броне танка имя дамы сердца анонимного вздыхателя — Вика.

Дырку от бублика?

Прежде. чем приняться за чай, посетители бара «Калі ласка» с любопытством рассматривают ложечки: просверленные в них дырки вызывают неописуемый интерес. Так администрация гомельского универмага решила вопрос борьбы с утечкой столового инструмента. Утечка же чая и кофе из этих ложечек еще до попадания в рот нисколько не волнует изобретателей дырявого новшества.

Теперь проголодавшиеся покупатели универмага с ужасом подумывают, а не увидят ли скоро в «барском меню» дырку от бублика?

Осталась форма

Приостановление деятельности КПСС—КПБ ввергло в непредвиденные расходы торговлю. Невостребованными лежат на прилавках магазинов обложки для членских билетов КПСС. Стоимость отделенной от содержания формы немалая — 2 и более рублей. В сумме это выливается в десятки тысяч. Вот и иронизируют торговые работники: а не повесить ли неустойку на партийные органы? Так сказать, по непреложному закону маркистско-ленинской философии—о единстве формы и содержания.

Анатолий ЛИПСКИЙ.

Печальная история

Наплевать нам

не только на будущие поколения, но, кажется, и на свою собственную жизнь. Иначе чем объяснить то безграничное равнодушие, с которым мы относимся к природе!

Объект этот называется станцией технического водоснабжения второй зоны. Расположен в самом центре города, хотя и в месте достаточно тихом, чтобы не привлекать посторонних взглядов — в тылу любимого минчанами парка имени Челюскинцев. Еще в конце декабря 1989 года подписан акт об окончании его строительства, но в будни и в праздники на станции обычно только две живые души — сторож с книжкой, да рыжая незлобливая дворняга на толстой веревке.

С вводом в строй этой станции должно было прекратиться варварское, по другому не скажешь, расходование питьевой артезианской воды на технические нужды едва ли не десятком предприятий, среди которых такие гиганты, как заводы имени Ленина, часовой, ЭВМ, имени Вавилова. Должно было, но не прекратилось.

По мнению специалистов, если сейчас запустить станцию, это может привести к последствиям, которые характеризуются двумя уже ставшими для нас обыденными словами — экологическая катастрофа. Дело в том, что так называемые баки мокрого хранения коагулянта — концентрированного раствора сернокислого алюминия — сооружены с нарушениями всех норм. Говоря попросту, емкости, как выяснилось, текут.

Сейчас уже не представляется возможным установить, чем руководствовалась комиссия, которая в самый канун 1990 года, когда добрые граждане уже собирались наполнить бокалы шампанским, подписала акт о сдаче этого объекта. Из ее членов уже почти никто не работает на прежних должностях. Скорее всего нужно было отчитаться о выполнении плана, во имя которого у нас в стране что угодно припишут. Правда, одновременно составили в этот декабрьский денек приложение к документу, где генеральный подрядчик — стройтрест № 1— обязывался в течение двух месяцев устранить сотню недоделок. С тех пор уже дважды на смену зиме приходило лето, а этот длинный перечень уменьшился не на много. Похоже, руководители стройтреста вообще стали забывать про этот объект. И это не удивительно. 3 миллиона — такова его стоимость — давно вошли ударной строкой в перечень трудовых побед коллектива.

